■ Даслоўна

# НЕ ПЕРАЙСЦІ МЯЖУ ГАСЦІННАСЦІ

## Як знайсці залатую сярэдзіну ў міграцыйнай палітыцы

**Лета — час, калі вялікія плыні людзей пачынаюць падарожнічаць. Вядома, не застаецца ў баку ад гэтага руху і Беларусь, асабліва калі размова ідзе пра ўязны турызм, які наша краіна імкнецца развіваць. Вялікай папулярнасцю карыстаецца аграэкатурызм, апошнім часам шмат замежнікаў прыязджае менавіта ў беларускія аграсядзібы. Працэдура працы з такімі гасцямі ў нас максімальна спрошчана. Так, напрыклад, гаспадары сядзіб упаўнаважаны самі выдаваць рэгістрацыю замежнікам. Ёсць яшчэ адна дэталь. Здараецца, што чалавек прыязджае не ў адзін горад, а ўвесь час рухаецца па турыстычным маршруце. У такім выпадку яму трэба рэгістравацца толькі ў першым месцы спынення. Таксама кіраўніком дзяржавы быў падпісаны ўказ аб спрошчаным парадку ўезду замежнікаў, якія з турыстычнымі мэтамі хочуць наведаць Белавежскую пушчу. Такім турыстам, каб трапіць на тэрыторыю нацыянальнага парку на тэрмін да трох сутак, нават не патрэбна віза.**

**Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з выконваючым абавязкі першага намесніка начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі — начальнікам упраўлення па міграцыі і рабоце з замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства Міністэрства ўнутраных спраў Віталем НАВУМЧЫКАМ і даведаўся, што за людзі прыязджаюць у Беларусь, з якімі праблемамі яны сутыкаюцца і якія ў міграцыйнай палітыкі нашай краіны перспектывы.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Апошнія змяненні ў міграцыйнае заканадаўства Беларусі ўнесліся год таму. Як яны сябе праявілі за гэты час?***

— З аднаго боку, закон «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь» стаў больш ліберальным, а з іншага, у яго былі ўнесены нормы, якія зрабілі міграцыйнае заканадаўства больш жорсткім.

> **«Што датычыцца парушэнняў менавіта міграцыйнага заканадаўства, то самымі распаўсюджанымі іх відамі з'яўляюцца ўезд без міграцыйнай карткі, парушэнне парадку рэгістрацыі і ўхіленне ад выезду пасля заканчэння тэрміну рэгістрацыі».**

Змены можна ацаніць станоўча, бо былі вырашаны некаторыя спрэчныя моманты. Напрыклад, раней агаворвалася, што кожны замежнік пасля ўезду ў Беларусь павінен на працягу пяці працоўных дзён зарэгістравацца. А па працоўным заканадаўстве выхадным лічыцца толькі нядзеля. У той жа час у некаторых арганізацыях у залежнасці ад рэжыму працы гэта маглі быць яшчэ і субота, і нават панядзелак. Атрымлівалася блытаніна: здаралася б, замежнік прыходзіць рэгістравацца ў панядзелак, у працоўны дзень, а падраздзяленне па грамадзянстве і міграцыі не працуе. Адзін дзень з пяці ўжо знікае, і не па віне прыезджага. Таму гэтую норму скарэкціравалі.

Яшчэ адзін прыклад — выкарыстанне такіх мер, як дэпартацыя і высылка. Пасля высылкі або дэпартацыі замежніка з тэрыторыі краіны да яго абавязкова прымяняецца забарона на ўезд на пэўны тэрмін. Раней ніжняя яе мяжа складала год. Але было зразумела, што часам такая санкцыя прымянялася да замежнікаў, якія маюць у Беларусі сям'ю ці нерухомасць, і год для іх — гэта крытычна вялікі тэрмін. Таму мяжу панізілі да шасці месяцаў.

Акрамя таго, за апошні час былі падпісаны пагадненні аб рэадмісіі з такімі краінамі, як Турцыя, Расія, Грузія, Казахстан. Гэта самы цывілізаваны інструмент супрацьдзеяння незаконнай міграцыі. Калі, напрыклад, на тэрыторыю Беларусі з тэрыторыі Расіі незаконна трапіць грамадзянін трэцяй краіны, то мы маем права перадаць яго расійскаму боку, а яны будуць абавязаны яго прыняць. Тое ж працуе і ў зваротным кірунку.

***— Як увогуле можна ахарактарызаваць сітуацыю з прыездам замежнікаў?***

— Ужо на працягу некалькіх гадоў яна стабільная, на гэта і накіравана наша праца. Міграцыйнае сальда застаецца станоўчым, у Беларусь на працу і пастаяннае месца жыхарства прыязджае больш людзей, чым выязджае. У першую чаргу гэта грамадзяне Расіі і Украіны, іншых краін СНД. Прыязджаюць і з Заходняй Еўропы, напрыклад, калі ўступаюць у шлюб з грамадзянамі Беларусі. Мэты прыезду самыя розныя — гэта і вядзенне бізнесу, і адукацыя...

Але ёсць і іншы бок пытання. Свой адбітак накладвае тое, што ў нас не ахоўваецца мяжа з Расіяй. Таму некаторыя грамадзяне трэціх краін, якія маюць расійскую візу, памылкова лічаць, што яны могуць законна знаходзіцца і на тэрыторыі Беларусі. Але гэта не так. Калі потым падчас міграцыйнага кантролю выяўляецца, што ў такіх людзей няма права на знаходжанне на тэрыторыі нашай краіны, то яны нясуць адпаведную адказнасць, а ў некаторых выпадках нават дэпартуюцца. Але ёсць і тыя, хто злоўжывае адкрытасцю беларуска-расійскай мяжы і едзе да нас не толькі з адной мэтай — незаконна трапіць у краіны Еўрасаюза праз Беларусь. Да 2012 года колькасць такіх парушэнняў зніжалася, але пасля зноў пачала расці, у першую чаргу ў сувязі з падзеямі ў краінах Афрыкі — людзі проста беглі ад вайны. Тым не менш, наша міграцыйнае заканадаўства дастаткова эфектыўнае для таго, каб гэтаму супрацьстаяць. Фактычна, мы ахоўваем Заходнюю Еўропу ад незаконных мігрантаў з усходу.

***— Ці шмат цяпер у Беларусь накіроўваецца перасяленцаў з Украіны?***

— Мы заўсёды ставіліся і ставімся да нашых паўднёвых суседзяў, як да братэрскай і ў гістарычным, і ў этнічным сэнсе краіны. А таму імкнёмся падтрымліваць сяброўскія адносіны. І калі ва Украіне пачаўся ўзброены канфлікт, мы ўваходзілі ў палажэнне людзей, якія беглі ад вайны ў Беларусь. Зразумела, што пад бамбёжкамі ты наўрад ці будзеш задумвацца, якія рэчы і паперы з сабой браць, таму нярэдка ўкраінцы прыязджалі без дакументаў, якія па нашым заканадаўстве неабходны для выдачы дазволу на пражыванне. Таму мы праініцыявалі перад Прэзідэнтам прыняцце дакумента, які максімальна спрасціў працэдуру ўезду і атрымання дазволу на пражыванне для ўкраінцаў, якія прыбываюць з тэрыторыі Данецкай і Луганскай абласцей.

> **«Але было зразумела, што часам такая санкцыя прымянялася да замежнікаў, якія маюць у Беларусі сям'ю ці нерухомасць, і год для іх — гэта крытычна вялікі тэрмін. Таму мяжу панізілі да шасці месяцаў».**

Што датычыцца дынамікі прыезду ўкраінцаў у Беларусь, то свайго піку колькасць бежанцаў дасягнула ў мінулым годзе. Тым не менш, плынь украінскіх мігрантаў застаецца вельмі моцнай. У першым квартале гэтага года менавіта з Украіны ў Беларусь прыехала больш за тры тысячы людзей — гэта самы вялікі паказчык сярод усіх краін. Для параўнання, летась за першыя тры месяцы года, калі канфлікт на Данбасе толькі пачынаў разгарацца, да нас прыехала прыкладна шэсцьсот украінцаў.

***— Ці шмат правапарушэнняў на тэрыторыі краіны здзяйсняюць прыезджыя?***

— Да праблемнай катэгорыі іх аднесці нельга. Ужо на працягу многіх гадоў колькасць злачынстваў сярод мігрантаў складае 1,3—1,5 працэнта ад агульнай масы зарэгістраваных у краіне. Гэта, па сутнасці, кропля ў моры. Можна канстатаваць, што прыезджыя не ўплываюць на крымінагенную сітуацыю ў краіне. Для параўнання зазначу, што, напрыклад, у Расійскай Федэрацыі ў залежнасці ад рэгіёна гэтая лічба складае да 20 працэнтаў.

Што датычыцца парушэнняў менавіта міграцыйнага заканадаўства, то самымі распаўсюджанымі іх відамі з'яўляюцца ўезд без міграцыйнай карткі, парушэнне парадку рэгістрацыі і ўхіленне ад выезду пасля заканчэння тэрміну рэгістрацыі.

> **«Мы праініцыявалі перад Прэзідэнтам прыняцце дакумента, які максімальна спрасціў працэдуру ўезду і атрымання дазволу на пражыванне для ўкраінцаў, якія прыбываюць з тэрыторыі Данецкай і Луганскай абласцей».**

***— Як па-вашаму, у якім кірунку павінна развівацца міграцыйная палітыка Беларусі ў будучыні? Магчыма, варта скарыстацца замежным вопытам, напрыклад заходнееўрапейскім?***

— Мне па рабоце нярэдка даводзіцца бываць у службовых камандзіроўках у іншых краінах, у тым ліку ў краінах Еўрасаюза. Знаёмячыся з працай іх сістэмы, я глыбока ўпэўніўся ў тым, што наша заканадаўства больш эфектыўнае. У 2013 годзе я быў у галоўным міграцыйным офісе Бруселя, і тамтэйшыя супрацоўнікі адкрыта шкадавалі, што ў свае часы бельгійскае заканадаўства было занадта лібералізавана. Цяпер яны сутыкаюцца з наступствамі некантраляванага прытоку грамадзян з іншых краін, якія не інтэграваліся ў грамадства, хоць многія заходнееўрапейскія спецыялісты кажуць аб зваротным. Я на свае вочы бачыў гэтых «інтэграваных» прыезджых у Швецыі, яны як не працавалі, так і не працуюць, сядзяць каля пераходаў, просяць міласціну, а яшчэ атрымліваюць нядрэнную фінансавую дапамогу ад дзяржавы. У Францыі сфарміраваліся закрытыя супольнасці мігрантаў, якія цяпер фактычна не прызнаюць юрысдыкцыю краіны знаходжання. У Бельгіі мне распавялі пра тое, што ў Бруселі, адным з палітычных цэнтраў Еўрасаюза, існуюць кварталы, куды паліцыя баіцца заязджаць.

Але мы цесна супрацоўнічаем з нашымі еўрапейскімі калегамі. З пачатку мінулага года вядзём перамовы па спрашчэнні візавых працэдур і па заключэнні дамоў аб рэадмісіі з Еўрапейскім саюзам. Увогуле, у нас былі амбіцыйныя планы аб падпісанні гэтых дакументаў яшчэ падчас Рыжскага саміту «Усходняга партнёрства», але еўрапейскія дэлегаты на апошніх экспертных кансультацыях не пайшлі на некаторыя ўступкі, якія мы хацелі атрымаць у спрашчэнні візавых працэдур. Тым не менш, я думаю, што з цягам часу мы ўсё адно прыйдзем да згоды ў гэтым пытанні і падпішам дамовы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Факт

## АДУКАЦЫЯ НА ДЗВЕ КРАІНЫ

**Сумесны факультэт інфармацыйных тэхналогій вырашылі стварыць Белдзяржуніверсітэт і Таджыкскі нацыянальны ўніверсітэт (ТНУ). Адпаведнае пагадненне падпісалі ў Душанбэ кіраўнікі ўніверсітэтаў акадэмікі Сяргей Абламейка і Махмадзюсуф Імомаў.**

Мяркуецца, што навучанне на новым факультэце распачнецца ўжо ў верасні гэтага года. Рыхтаваць студэнтаў будуць па спецыяльнасцях «прыкладная інфарматыка», «камп'ютарная бяспека», «матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі». Адукацыйны працэс будзе ажыццяўляцца па сістэме «2 + 2»: два гады таджыкскія студэнты навучаюцца ў ТНУ, а наступныя два — у БДУ, дзе і адбудзецца абарона дыпломнай працы. Пры факультэце таксама будуць працаваць падрыхтоўчае аддзяленне і курсы для абітурыентаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## ЛЯЛЬКІ З ГЛІНЫ, ЛЁНУ, ТЭКСТЫЛЮ...

**Больш за 60 лялек ручной работы будуць прадстаўлены з 23 чэрвеня ў Гродзенскай выставачнай зале. Выстава «Лялькі» арганізавана Генеральным консульствам Літоўскай Рэспублікі ў Гродне і Саюзам мастакоў Літвы.**

Лялькі ручной работы — гэта нядаўна адроджаны ў Літве від мастацтва. Цацкі, якія некалі выраблялiся бабулямі і мамамі з падручных матэрыялаў, цяпер сталі так званымі «інтэр'ернымі лялькамі» — увасабленнем майстэрства, карпатлівай працы, цярпення і фантазіі рукадзельніц. Лялькі выраблены з розных матэрыялаў — гліны, лёну,тэкстылю, скуры, натуральнай шэрсці і іншага.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

## ЛЕПШ ПАПЯРЭДЗІЦЬ

**Антытэрарыстычнае вучэнне па спыненні тэрарыстычных актаў і мінімізацыі іх наступстваў на аб'ектах газатранспартнай галіны прайшло на тэрыторыі краіны.**

Як паведамляе прэс-служба Камітэта дзяржбяспекі, парадак рэагавання ў такіх сітуацыях адпрацоўвалі прадстаўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, Міністэрства аховы здароўя і адкрытага акцыянернага таварыства «Газпрам трансгаз Беларусь». Адпрацоўваліся таксама практычныя дзеянні правядзення контртэрарыстычнай аперацыі пры ўзнікненні тэрарыстычнай пагрозы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## МАЛЕНЬКІЯ. АЛЕ ЗА 132 МІЛЬЁНЫ

Такую суму за незаконны промысел давядзецца пакрыць браканьерам

**У Пухавіцкім раёне на разводдзі возера Сяргеявіцкага супрацоўнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету затрымалі мінчаніна і жыхара Слуцка, якія пры дапамозе 20 пастак незаконна здабылі 489 асобін вузкапалага рака агульнай вагой 20 кілаграмаў.**

У засаду нелегалы трапілі невыпадкова: дзяржінспектары правяралі інфармацыю, якая паступіла да іх, пра тое, што на возеры браканьеры ловяць ракаў ледзьве не ў прамысловых маштабах.

— Затрыманыя парушальнікі сцвярджалі, што ніколі не чулі пра вызначаную норму вылаву — два кілаграмы на чалавека. Тым не менш лавілі яны пад покрывам ночы, нібыта чагосьці баючыся. Выкарыстоўвалі пры гэтым асвятляльныя прыборы, што таксама забаронена. Па памерах многія асобіны рака ў іх улове не дацягвалі да прамысловай меры ў 10,5 сантыметра, — расказала прэс-сакратар Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вольга Грамовіч.

Сярод канфіскаваных пастак дзяржінспектары знайшлі цікавы экзэмпляр. Эксперыментальную канструкцыю ўласнаручна вырабіў адзін з затрыманых — навуковец-тэхнолаг. Прылады таксама не адпавядалі неабходным стандартам. Па правілах дыяметр пасткі для ракаў не павінен перавышаць 100 сантыметраў, а ячэйка сеткі не можа быць меншай за 22 міліметры. Аднаму чалавеку дазваляецца ўстанаўліваць не больш за тры пасткі, пакідаць іх без нагляду забаронена.

За незаконную здабычу ракаў парушальнікам давядзецца выплаціць амаль 132 мільёны рублёў (па 1,5 базавай велічыні за кожную асобіну). Вырашаецца і пытанне крымінальнай адказнасці браканьераў.

## САБАЧАЯ КАНТРАБАНДА

**280 прадметаў зоатавараў спрабавалі незаконна ўвезці ў краіну жыхар Брэсцкай вобласці.**

Незадэклараваная пры ўвозе на тэрыторыю Еўразійскага эканамічнага саюза камерцыйная партыя тавару была выяўлена ў аўтадарожным пункце пропуску «Дамачава».

Жыхар Брэсцкай вобласці ехаў з Польшчы на «Фордзе» і пры перасячэнні мяжы выбраў для руху «зялёны» калідор, прызначаны для перасоўвання тавараў для асабістага карыстання, якія не падлягаюць дэклараванню. Пасля выезду транспартны сродак быў спынены і накіраваны ў бокс для мытнага агляду. Яго вынікам стала знаходка 280 прылад для сабак: ашыйнікі, наморднікі, розныя віды мячыкаў (паведамілі ў прэс-групе Брэсцкай мытні). Агульны кошт выяўленага і канфіскаванага да рашэння суда тавару склаў каля 50 мільёнаў рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*